награфію дзіця знаёміцца з этнасам – народам, яго культурай і побытам ад старажытных часоў да нашых дзён.

Побач з аналізам агульнага і асаблівага этнаграфічная навука разглядае адзінкавае, на базе якога пазнаецца спецыфічнае і асаблівае для дадзенага этнасу, а таксама агульныя рысы, якія аб'ядноўваюць гэты этнас з іншымі. Этнаграфічныя веды уплываюць на фарміраванне духоўнай культуры маленькага дзіцяці. Яно спасцігае духоўнае багацце беларускага народа праз вусна-паэтычную творчасць, звычаі, абрады.

Народныя паданні, легенды беларусаў адлюстроўваюць прыроду Беларусі, яе гераічнае мінулае, вобразна і маляўніча падкрэсліваюць наш нацыянальны каларыт. Зразумела, што гэтым творам уласціва пэўная ўмоўнасць і алегорыя. Апісанні знешняга выгляду і паводзін жывёл адлюстроўваюць некаторыя рысы характару чалавека і адносіны, якія адбываюцца паміж людзьмі. Тое ж тычыцца і народных казак пра жывел. Разам з тым гэтыя творы даюць магчымасць педагогу выхоўваць у дзяцей здольнасць да перажыванняў, клапатлівыя адносіны да ўсяго жывога.

Вусна-паэтычная творчасць беларускага народа прасякнута любоўю і павагай да чалавека, міласэрнасцю, дабрынёй.

Творы вуснай народнай творчасці і сёння з'уяляюцца для нас найбольш зручным падручнікам, з дапамогай якога можна вобразна і маляўніча, хутка і лёгка пазнаёміць дзяцей з родным краем, яго побытам, рамёствамі, прыродай.

Беларусы выхоўвалі сваіх дзяцей у любові да роднай Бацькаўшчыны, да яе прыроднага асяроддзя. Моўная творчасць дапамагала дарослым вучыць малых бачыць змены, якія адбываліся ў жыцці.

Прынцып прыродаадпаведнасці быў асноватворным у выхаванні дзіцяці. Гэта яскрава пацвярджаецца сродкамі ўвасаблення гэтага прынцыпу ў жыцце.

Каляндарна-абрадавая паэзія ў маляўнічых вобразах адлюстроўвае лад народнага жыцця. яго сувязь з прыродным светам. Абрады беларусаў захаваліся да нашых дзён. Асноватворныя рысы гэтых абрадаў у пэўнай ступені ўплываюць на патрыятычнае выхаванне дзіцяці, яго грамадзянскасць.

В. А. Сухамлінскі патрабаваў беражлівых адносін да духоўнага скарбу народа, асноватворным у якім лічыў традыцыі, што пераходзяць ад аднаго пакалення да другога. Ён разглядаў духоўнае багацце асобы як частку духоўнага багацця нацыі. Па меркаванні В. А. Сухамлінскага, у будучым грамадзяніне адлюстроўваецца ўся шматгадовая гісторыя, усе традыцыі і звычаі. Дзіця непарыўна звязана з мілым сэрцу кутком, дзе яно нарадзілася, расло і сталела.

З самага ранняга дзяцінства неабходна абуджаць цікавасць дзяцей да свайго радаводу, да бацькоў, выхоўваць пачуццё гонару за працоўныя, творчыя справы старэйшых пакаленняў, фарміраваць пачуццё павагі да роднай хаты, да сваёй Радзімы.

Этнаграфічная спадчына, яе матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці вызначаюць сабой педагагічны скарб народа. Без выкарыстання гэтага скарбу ў выхаваўчым працэсе немагчыма вахаванне будучага грамадзяніна-патрыёта.

## ВЫКАРЫСТАННЕ ЭТНАГРАФІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ВЫХАВАННІ ДАШКОЛЬНІКАЎ

***Д. М.. Дубініна (г. Минск)***

На сучаснам этапе развіцця грамадства вялікае значэнне надаецца праблеме выхавання грамадзянскасці, нацыянальнай свядомасці, патрыятызму. Дасягнуць пэўных вынікаў у гэтай справе немагчыма без вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, выкарыстання ў выхаваўчым працэсе этнаграфічнай спадчыны

З самага дзяцінства [illegible]ькі чалавек выхоўваецца на аснове назапашаных папярэднімі пакаленнямі традыцый, звычаяў, абрадаў. Менавіта выкарыстанне народнага вопыту, этнаграфічных ведаў спрыяе фрміраванню сапраўднага грамадзяніна-патрыёта сваёй Бацькаўшчыны.

Яшчэ Я. А. Каменскі, абагульняючы вопыт сямейнага выхавання, улічваў традыцыі і звычаі народа. Другі вядомы вучоны-гуманіст І. Г. Песталоццы раіў у выхаванні дзяцей звяртацца да педагагічнага вопыту народа. На думку К. Д. Ушынскага, менавіта традыцыі народнага выхавання ўяўляюць сабой вялікую каштоўнасць у гістарычным працэсе развіцця нацыі.

Канцэпцыя дашкольнай адукацыі ў нашай рэспубліцы пабудавана ў адпаведнасці з прынцыпамі гуманізацыі ўсей сістэмы выхавання. Гэты прыцып выступае вызначальным у засваенні нацыянальных каштоўнасцей, сярод якіх адной з асноўных з'яўляецца этнаграфічная спадчына.

Этнаграфічныя веды уключаны ў змест нацыянальнай праграмы дашкольнай адукацыі «Пралеска». Задачы дашкольнай установы – стварыць спрыяльныя педагагічныя умовы для ажыцяўлення патрабаванняў праграмы адносна этнаграфічнай адукацыі выхаванцаў.

Абагульненне вопыту работы дашкольнай установы дазваляе выдзяліць некаторыя эфектыўныя арганізацыйна-выхаваўчыя накірункі дзейнасці.

Мэтазгодна арганізаваць семінары-практыкумы, лекторыі для выхавальнікаў дашкольнай установы і іх бацькоў па атрыманні імі неабходных этнаграфічных ведаў. Карыснымі будуць такія семінары, як «Этнаграфія дзяцінства», «Вусна-паэтычная творчасць беларусаў», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Народныя песні і харэаграфія» і інш.

Значны выхаваўчы патэнцыял маюць клубы для дзяцей, бацькоў і выхавальнікаў, асноўная задача якіх – вывучэнне і захаванне традыцый, звычаяў, абрадаў беларусаў. Асэнсаванне сваёй культуры адбываецца ў выніку дзейнасці, а таксама пры непасрэдным параўнанні сваёй нацыянальнай культуры з іншымі.

Мэтазгодна наладзіць педагагічны працэс такім чынам, каб не толькі адбывалася знёмства дзяцей з этнаграфічнай спадчынай беларусаў, але і ўсё жыццё ў дашкольнай установе будавалася на прынцыпах культураадпаведнасці і прыродаадпаведнасці.

## ФЕНОМЕН ГРАЖДАНСТВЕННОСТИ
## (исторический очерк)

*В. А. Дудко (г. Барановичи)*

**Во времена античной демократии гражданствениость оценивалась как высшая добродетель свободной личности. Тогда поиятие граждаиственности включало в себя несколько существенных призиаков этой добродетели: добросовестное выполнение семейного, родительского, воинского долга плюс активная политическая деятельность в официальных органах управления, т. е. деятельность по совершенствованию системы управления в разных отраслях человеческой деятельности, а точнее, деятельность по преобразованию и ликвидации устаревших полностью или устаревающих культурных регуляциоиных образцов. Данное понимаиие является, на взгляд автора, рациональиым и в качестве такового фуикционирует и в иаши дни. Во времена Сократа, Платона, Аристотеля активная и массовая гражданственность воспроизводилась самым естественным образом – на**